# Ушанаваць песняра…

**XXXVIII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Каласавіны» ўжо стала гісторыяй. Коласазнаўцы (інакш, праслухаўшы іх глыбокія грунтоўныя даследаванні ў самых розных кірунках, не сказаш) выступалі з вялікай пашанай да асобы Якуба Коласа. Тэматыка дакладаў была разнастайная, як шматгранная творчасць народнага паэта.**

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ірына Мацяс адразу акцэнтавала ўвагу на развіцці міжнародных стасункаў. Так, у 2023-м коласаўскі музей заключыў пагадненне аб супрацоўніцтве з Дзяржаўным музеем-запаведнікам М. А. Шолахава ў Растове-на-Доне. Дзякуючы супрацоўніцтву з Цяньцзіньскім універсітэтам замежных моў у 2024-м з'явілася выданне з перакладамі на кітайскую мову апавяданняў з цыкла «Казкі жыцця» Якуба Коласа. Сімвалічна, што першыя даклады Вольгі Шахаб і Касандры Сіямак Шахаб-Касцецкай з Цяньцзіньскага ўніверсітэта замежных моў прысвячаліся менавіта ўзбагачэнню маўлення кітайскіх студэнтаў на аснове твораў Якуба Коласа, а таксама цяжкасцям, з якімі сутыкнуліся падчас перакладу «Казак жыцця» на кітайскую мову. Вялікую ролю ў міжнародных адносінах выконвае Саюз пісьменнікаў Беларусі. Невыпадкова старшыня СПБ Алесь Карлюкевіч падчас выступлення нагадаў, што цяпер творы Коласа (які, дарэчы, з'яўляецца адным з ініцыятараў стварэння нацыянальнага пісьменніцкага саюза) ёсць не толькі на кітайскай, але і на мангольскай, уйгурскай, казахскай, узбекскай, калмыцкай, азербайджанскай і іншых мовах.

***Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Каласавіны-2024» была прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 65-годдзю Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Работа вялася ў дзвюх секцыях. Заяўленыя тэмы былі адлюстраваны ў выступленнях кожнага з дакладчыкаў. Асабліва актуальным стаў даклад вучонага сакратара Дзяржаўнага музея-запаведніка М. А. Шолахава «Ціхі Дон» Лідзіі Слюсарэнкі. Яна падрабязна распавяла пра культурна-асветніцкія праекты, звязаныя з захаваннем памяці пра Вялікую Айчынную вайну. «Сёння, калі перапісваецца гісторыя, робяцца спробы фальсіфікацыі сэнсаў, музеі выступаюць гарантамі гістарычнай праўды», — падкрэсліла Лідзія Міхайлаўна падчас выступлення.***

Вітаючы даследчыкаў, Ірына Мацяс выказала вялікую падзяку за тое, што за столькі гадоў існавання канферэнцыі знаходзяцца новыя падыходы да вывучэння творчасці песняра, адшукваюцца дакументы, якія дазваляюць пагартаць новыя старонкі коласаўскай біяграфіі. Вялікі ўнёсак у гэтую справу робяць не толькі сур'ёзныя навукоўцы, але і «сямейнікі». У тым ліку праўнучка Якуба Коласа, галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Васіліна Міцкевіч. Яе імя і прозвішча гучала неаднойчы, бо яна здолела знайсці ўжо больш за 20 коласаўскіх інскрыптаў. Не абышлося і без выступлення ўнучкі Якуба Коласа, навуковага супрацоўніка аддзела экалогіі



*Невядомы мастак. Партрэт Якуба Коласа, 1952 г.*

традыцыйнай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Веры Міцкевіч, якая прэзентавала мемарыяльную сядзібу Ласток — філіял коласаўскага музея — у сістэме экалогіі традыцыйнай культуры. Гэта найбольш аддаленая сядзіба на Стаўбцоўшчыне, адзіная, дзе захаваліся аўтэнтычныя пабудовы — гумно і сама хата. Вера Данілаўна згадала, наколькі Ласток паўплываў на творчасць будучага паэта. Дэманстраваліся слайды, дзякуючы чаму ўдалося наведаць гэты край і адчуць яго ўнікальны турыстычны патэнцыял, які дагэтуль яшчэ не раскрыты цалкам. Менавіта ў Ластку Колас збіраў фальклорныя матэрыялы, якія пасля выкарыстаў у сваёй творчасці. Першапачаткова ў філіяле размяшчалася экспазіцыя, прысвечаная «Сымону-музыку», пасля — народным беларускім святам. Вера Міцкевіч падкрэсліла, наколькі важна, што гэтая сядзіба, дзе коласаўская сям'я жыла каля пяці гадоў, захоўваецца як гісторыка-культурная каштоўнасць.

Дзякуючы каментарыям Веры Данілаўны да дакладаў некаторых выступоўцаў у прысутных складваўся шматгранны вобраз песняра. Асабліва было цікава пачуць яе меркаванне наконт ролі Аляксандры Рамановіч (Зотавай) у мемуарыстыцы і эпістолярнай спадчыне Коласа. Тэму важнасці яе асобы ў жыцці песняра ўзняў Мікола Трус, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў стараддрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Была звернута ўвага прысутных на знешняе падабенства жонкі песняра да яго знаёмай, якой Колас дасылаў даволі вялікія лісты. Знаёмства іх адбылося ў 1907 годзе ў рэдакцыі газеты «Наша ніва». На жаль, не ўсё з таго ліставання захавалася з-за рэўнасці мужа Аляксандры. Вера Міцкевіч пацвердзіла, што гэта была толькі вялікая сімпатыя, да якой ніяк нельга было прычапіцца, але ж… Страчаныя паперы маглі адкрыць новыя рысы характару Коласа.

Вылучалася выступленне Вольгі Наважылавай, загадчыцы навукова-асветніцкага аддзела Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Яна нагадала гісторыю стварэння оперы А. В. Багатырова «У пушчах Палесся» паводле коласаўскай аповесці «Дрыгва». Было цікава пачуць пра сінтэз музычнага мастацтва і літаратуры, даведацца, чым адметнае ўвасабленне аповесці на опернай сцэне, наколькі яно адрозніваецца ад першакрыніцы і як часта сам аўтар прысутнічаў на рэпетыцыях.

Актуальна прагучаў даклад дацэнта кафедры менеджменту і камунікацый Інстытута сучасных ведаў імя А. М. Шырокава, кандыдата філалагічных навук, дацэнта Алены Гурскай. Яна адзначыла, што Колас — пачынальнік тэмы Хатыні і канцэнтрацыйных лагераў. У яго нарысе «Лагер смерці» (арыгінальная назва «Крыжовы шлях», але яна была зменена ў рэдакцыі) паказана, як людзей гналі на смерць… Алена Гурская назвала гэты твор дакументальна-мастацкім увасабленнем трагедыі беларускага народа.

Упрыгожыла тэматыку канферэнцыі выступленне вядучага навуковага супрацоўніка аддзела навукова-асветніцкай работы і маркетынгу Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Настассі Трафімчык. Яна прадэманстравала прыжыццёвыя партрэты Якуба Коласа, паказаўшы, як па-рознаму мастакі трактавалі вобраз песняра.



*Выступае Настасся Трафімчык.*

Удзельнікі і госці канферэнцыі мелі магчымасць пазнаёміцца з невядомым шырокаму колу партрэтам народнага паэта, які знаходзіцца ў прыватнай калекцыі яго сям'і. Настасся Трафімчык падзякавала за магчымасць дэманстрацыі гэтай работы (яна створана ў 1952 годзе невядомым аўтарам, хутчэй за ўсё да 70-годдзя Коласа) Васіліне Міцкевіч. Была згадана і гісторыя стварэння работы, якая ўпрыгожвае коласаўскі музей. Настасся Трафімчык нагадала, што партрэт напісаны ў кастрычніку — лістападзе 1953 года заслужаным дзеячам мастацтваў РСФСР Гаўрылам Гарэлавым. Па ўспамінах яго дачкі, жонкі Заіра Азгура Галіны Гарэлавай-Азгур, партрэт напісаны з натуры ў рабочым кабінеце віцэ-прэзідэнта АН БССР Якуба Коласа. Цікава, што сам пісьменнік у лісце да Алесі Кетлер ад 12 кастрычніка 1953 года скардзіўся: «Имел неосторожность дать согласие художнику позировать. Художник весьма хороший из Москвы, тесть Азгура. Портрет почти что написан, но сколько ни позируй художникам, они никогда не скажут "довольно"». Той вобраз, які ў выніку атрымаўся, цяпер можа ацаніць кожны наведвальнік коласаўскага музея. Настасся Трафімчык прыгадала і ўспаміны самога З. Азгура пра знаёмства з паэтам у 1924 годзе: «Першае ўражанне, якое на мяне зрабіў паэт, было: гэта суровы чалавек. Мне нават здалося, што ён не столькі ўсміхаецца, колькі стараецца ўсміхацца». Эксперт звязвае такі максімальна афіцыйны выгляд Коласа не толькі з тым, што ён займаў пасаду віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук і насіў высокае званне народнага паэта, а яшчэ і з асаблівасцю характару — яго маўклівасцю, заглыбленасцю ў сябе, знешняй зацятасцю і суровасцю. Такі вобраз замацаваўся яшчэ пры жыцці паэта і неаднаразова паўтараўся пасля яго смерці. Былі згаданы і знакаміты помнік на плошчы Якуба Коласа, які перажыў ваенны час, — адметная работа З. Азгура. Настасся Трафімчык звярнула ўвагу на тое, што Азгур быў знаёмы з паэтам асабіста яшчэ ў 1920-х. Ён чатыры разы ляпіў Коласа з натуры і заўсёды імкнуўся перадаць асаблівасці яго ўнутранага свету. Выступоўца паведаміла прысутным і пра знаходку гэтага года — коласаўскі партрэт пэндзля Зянона Паўлоўскага 1950 года. Цалкам з гэтым надзвычай цікавым матэрыялам, як і з іншымі не менш значнымі дакладамі, можна будзе пазнаёміцца, калі выйдзе Збор выступленняў XXXVIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Каласавіны-2024».

Сёлета адзначаецца 110 гадоў з дня нараджэння старэйшага сына Коласа Данілы Канстанцінавіча. Менавіта ён стаяў каля вытокаў стварэння мемарыяльнага музея. Пасля завяршэння афіцыйнай часткі канферэнцыі Вера Міцкевіч правяла для ўсіх цікавую экскурсію па часовай экспазіцыі «Заступнік бацькавай спадчыны», прысвечанай першаму дырэктару музея. «Разумееце, як літаральна на 180 градусаў змянілася жыццё Данілы Канстанцінавіча, калі яму, хіміку, вучонаму ў 1956 годзе, калі не стала бацькі, давялося займацца зусім іншай справай — ушаноўваць памяць Коласа, захоўваць яго багатую спадчыну па даручэнні Цэнтральнага камітэта кампартыі і Савета міністраў. Сямейныя шафы, кнігі з дарчымі надпісамі (ёсць і аўтограф У. Караткевіча на асобніку «Дзікага палявання караля Стаха»), унікальныя фотаздымкі…»





*Вера Міцкевіч праводзіць экскурсію.*

**Ірына ПРЫМАК**
**Фота аўтара**
**і Кастуся ДРОБАВА**